женского, так и мужского пола, вообще оставалась полною хозяйкой в доме и могла самостоятельно распоряжаться имуществом. По достижении сыновьями совершеннолетия мать-вдова (по сведениям Климовичского уезда) во многих случаях сохраняла свои права до своей смерти, но с некоторыми ограничениями по управлению хозяйством» [2, с. 12–13].

3 июня 1912 г. Государственной Думой Российской империи был принят закон об уравнении в правах наследования, по которому женщины уравнивались с мужчинами при наследовании только движимого имущества. Что же касается недвижимого имущества, то в этом отношении и в 1912 г. женщины не были уравнены в правах: доля сестры при братьях составляла одну седьмую [11, с. 405, 441–442]. В праве наследования женщины не были равноправны с мужчинами вплоть до революции.

Таким образом, в основе семейного права лежал принцип главенства мужчины в семье и личной подчиненности женщины. В соответствии с общероссийским гражданским законодательством начала XX в. в правовом положении женщин белорусских губерний в сфере брачно-семейных отношений в сравнении с центральными регионами Российской империи существенных отличий не было. На реализацию и специфику брачных практик (возрастной ценз вступления в брак, возрастная разница супругов, количество детей и т. д.) влияли сословное положение, этнический фактор, обычаи и религиозные нормы. Российское семейное право в рассматриваемый период не соответствовало требованиям времени, поскольку в начале XX в. все больше женщин стремились зарабатывать самостоятельно, но без разрешения мужа не мели права устроиться на работу, даже имея специальность. Право выбора места жительства семьи принадлежало мужу, в этом было еще одно препятствие для реализации женщиной своих профессиональных знаний, поскольку женщина должна была искать работу только в той местности, которую выбирал муж. Тем не менее согласно законодательству дореволюционного периода женщина все же являлась субъектом правовых отношений, как и мужчина. Она имела право приобретать, владеть и распоряжаться движимым имуществом по своему усмотрению.

Библиографические ссылки

1. Безобразов, В.П. О правах женщины / В.П. Безобразов. М., 1895.
2. Брандт, А. Юридические обычаи крестьян Могилевской губернии / А. Брандт. Б.м.: [Тип. А. С. Суворина ], Б.г.
3. Довнар-Запольский, М.В. Исследования и статьи / М.В. Довнар-Запольский. Киев : Издание А.П. Сапунова, 1909.
4. Исаченко, В.В. Законы Гражданские / В.В. Исаченко // Свод законов. СПб., 1916. Т. X. Ч. 1.
5. Кантарович, Я.А. Законы о женщинах. Сборник всех постановлений действующего законодательства, относящихся до лиц женского пола / Я.А. Кантарович. СПб., 1899.
6. Пространство и население России в 1905 г. СПб. : Типогр. Н.Л. Ныркина, 1906.
7. Собрание узаконений и распоряжений правительства, издаваемое при Правительствующем Сенате. М. : Мысль, 1914.
8. Стайтс, Р. Женское освободительное движение в России: феминизм, нигилизм и большевизм, 1860–1930 / Р. Стайтс ; пер. с англ. М. : Росспэн, 2004.
9. Таль, Л.С. Очерки промышленного рабочего права / Л.С. Таль. 2-е изд. М. : Второе Моск. науч. изд-во, 1918.
10. Хвостов, В.М. Женщина накануне новой эпохи. Два этюда по женскому вопросу / В.М. Хвостов // Мужские ответы на женский вопрос в России (вторая половина XIX – первая треть XX в.) : антология : в 2 т. / сост. и общ. ред. В. Успенская. Тверь : Феминист-пресс, 2005. Т. 2.
11. Шершеневич, Г.Ф. Учебник русского гражданского права / Г.Ф. Шершеневич : в 2 т. М., 1915. Т. 2.

***А.М. Сувалаў**, старшы выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь*

# ЭТНАГЕНЕЗ І ЭТНІЧНАЯ ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСАЎ У ПОГЛЯДАХ М.В. КАЯЛОВІЧА

*Аналізуюцца погляды аднаго з бацькоў заходнерускай ідэалогіі М.В. Каяловіча на этнагенез і этнічную гісторыю беларусаў. Разглядаюцца пануючыя палажэнні гістарыяграфіі XIX ст. на этнагенетычныя працэсы Усходняй Еўропы, вызначаюцца фактары, якія аказалі дамінуючы ўплыў на фарміраванне поглядаў даследчыкаў адносна беларусаў. Аналізіруецца сітуацыя, у адпаведнасці з якой у якасці этнічнай асновы беларусаў М.В. Каяловіч выдзяляў толькі ўсходнеславянскія плямёны крывічоў і дрыгавічоў, не ўказаўшы радзімічаў. Не ўказваліся ў ліку этнічнай асновы беларусаў і неславянскія элементы. Робіцца выснова, што падставу падобнага ігнаравання трэба бачыць не столькі ў навуковых падыходах, колькі ў палітычных перакананнях М.В. Каяловіча і ва ўстаноўках заходнерускай ідэалогіі. Акцэнтуецца ўвага на агульным значэнні постаці М.В. Каяловіча ў фарміраванні поглядаў расійскай гістарыяграфіі на беларускую праблематыку.*

Айчынная гістарыяграфія да апошняга перыяду не надавала сур'ёзнай увагі постаці М.В. Каяловіча. З часоў прафесара А. Цвікевіча ў беларускай гістарыяграфіі М.В. Каяловіч выступае ў якасці аднаго са стаўпоў «заходнерусізму» [8, с. 142]. Нягледзячы на тое, што манаграфія А. Цвікевіча, прысвечаная ў тым ліку і асобе «бацькі» заходнерускай ідэалогіі, была напісана напачатку XX ст., а

пабачыла свет толькі напрыканцы гэтага стагоддзя, стаўленне да М.В. Каяловіча як да рэакцыянера не аспрэчвалася. У савецкі перыяд традыцыяй стала ігнараванне як самой ідэалогіі заходнерусізму, так і яе прыхільнікаў. Як вынік, праблема этнагенезу і этнічнай гісторыі беларусаў у поглядах М.В. Каяловіча, яго прыхільнікаў і паслядоўнікаў не знайшлі яшчэ дастатковага аналізу ў айчыннай гістарыяграфіі. Між тым пазіцыі «Калумба» Беларусі (як тытулаваў у свой час М.В. Каяловіча А. Сапуноў, маючы на ўвазе ролю і значэнне яго публікацый на фарміраванне ўяўленняў шырокіх колаў расійскай грамадскасці на Беларусь і беларусаў) прадстаўляюцца тыповымі і рэпрэзэнтатыўнымі для перыяду сярэдзіны і другой паловы XIX ст. У сувязі з гэтым даследаванне аднаго з цэнтральных пытанняў гістарыяграфіі народа – праблемы этнагенезу і этнічнай гісторыі беларусаў – у поглядах М.В. Каяловіча прадстаўляе навуковы інтарэс у агульным аналізе фарміравання этнагенетычных канцэпцый XIX ст.

Мэтай разгляду ўказанай праблемы з’яўляецца аналіз як саміх пазіцый М.В. Каяловіча на паходжанне і этнічную гісторыю беларусаў, так і падстаў і фактараў (у тым ліку не толькі навуковых), што паўплывалі на яго светапогляд. Пачнем з таго, што «заходнерусізм» як ідэалогія паўстае ў сярэдзіне XIX ст. мясцовай разнавіднасцю рэакцыйных падыходаў да нацыянальных ускраін тагачаснай Расійскай імперыі, а менавіта Украіны і Беларусі. Увараўская формула «самаўладдзе, праваслаўе і народнасць» на мясцовай глебе трансфармавалася ў шэраг палажэнняў, якія і прынята называць «заходнерусізмам».

«Заходнерусізм» – з’ява шматпланавая і шматгранная. Для нашага разгляду істотна падзяляць і размяжоўваць паняцці «палітычны» і «навуковы» «заходнерусізм». Вывучэнне матэрыялу паказвае магчымасць і вартасць такога размежавання. Прадстаўнікамі названага накірунка былі і К. Гаворскі, і А. Сапуноў, і М. Каяловіч, і С. Кавалюк, і Л. Саланевіч, і П. Бывалькевіч, і А. Уруцэвіч. Адзіны пералік паказвае несупаставімасць поглядаў гэтых дзеячоў з пункту гледжання іх уклада ў навуковае вывучэнне беларусаў.

З шэрагу названых асоб і дзеячоў «заходнерусізму» наогул бадай аднаго М.В. Каяловіча можна аднесці адначасова да «навуковай» і «палітычнай» плыняў. Ён унікальна сумяшчаў у сабе выдатныя навуковыя здольнасці з рэакцыйнымі, даволі далёкімі ад якой бы там ні было навуковасці, палітычнамі перакананнямі. Прафесар А. Цвікевіч, якога нельга нават западозрыць у прыхільнасці да «заходнерусаў», падкрэсліваў, што па багацці гістарычнага матэрыялу і распрацоўцы першарадных архіўных крыніц даследванне М.В. Каяловіча «Літоўская царкоўная унія» [3] павінна быць прызнана адным з лепшых у сваім родзе [8, с. 150]. У той жа час яго шматлікія нападкі на Польшчу і палякаў нельга ўспрымаць з пункту гледжання навукі.

Асноўныя ідэі «заходнерусізму» вядомы. У спрошчаным варыянце яны наступныя: непрызнанне этнічнай самастойнасці беларусаў і ўкраінцаў, далучэнне іх у этнічным плане да рускага народа. Пры гэтым паняцце «рускі народ» трактавалася блізка да сучаснага «ўсходнія славяне», з той толькі розніцай, што ў першым выпадку ўласна рускія (велікарусы) выступалі ў якасці галоўнага і дамінуючага народа, у той час як беларусы і ўкраінцы – як яго (рускага народа) складаючыя часткі. Варыянты падобнай пазіцыі ў адных выпадках маглі прызнаваць за галінамі «рускага народа» пэўную ступень самастойнасці (без дакладнага тлумачэння, што канкрэтна маецца на ўвазе), або разглядаць беларусаў і ўкраінцаў толькі ў якасці этнаграфічных груп велікарусаў.

Прадстаўнікі «заходнерусізму», так званыя «заходнерусы», былі па сваім паходжанні беларусамі, аднак па палітычным і навуковым перакананням яны выступалі з пазіцый афіцыяльнай народнасці, з пазіцый адзінства ўсходнеславянскага («рускага») народа. Найбольш дакладна пазіцыя «заходнерусаў» выказана М.В. Каяловічам у яго «Чытаннях па гісторыі Заходняй Расіі»: «...ці не лепш рабіцца велікарусам, а не палякам, ці не лепш прыстаць да дужага, чымсці да слабага, ці не лепш зліваццa з магутнаю, спакойнаю Расіяй, чым са слабаю… Польшчаю?» [6, с. 10].

Асаблівасцю даследаванняў гісторыі Беларусі ў перыяд другой паловы XIX ст. было тое, што вывучэнне рэгіёна працякала ва ўмовах абвастрэння барацьбы двух, як тады казалі, «элементаў» у нашым краі: рускага і польскага. Гэта асабліва праявілася ў час паўстання 1863–1864 гг. і рэакцыі 80-х гг. XIX ст. Рэгулярна выходзілі з друку афіцыйныя і паўафіцыйныя публікацыі палемічнага характару, накіраваныя на актывізацыю барацьбы з уплывам так званага «польскага элемента» і каталіцтва ў Беларусі. Шмат хто з «заходнерусаў» быў схільны бачыць у асаблівасцях беларусага этнасу (яго мове, фальклору і этнаграфіі) праявы польскага «ўплыву», а ў памкненнях беларускай інтэлігенцыі ўвесці беларускую мову ў афіцыйны друк – «польскую прапаганду», скіраваную на парушэнне агульнарускага адзінства. У публікацыях, скіраваных супраць падобнага роду праяў «польскасці», шырока выкарыстоўваліся матэрыялы гістарычнага мінулага беларускага народа ў неабходнай аўтарам інтэрпрытацыі. Асаблівае месца ў гэтым плане належыць М.В. Каяловічу як публіцысту, які аказваў значны ўплыў на фарміраванне адносін расійскай навуковай грамадскасці да беларускага рэгіёна. У многім, дзякуючы менавіта яго публікацыям, адносна беларусаў фарміравалася ўяўленне як аб адной, безумоўна, рускай галіне. Так, паслядоўна выступаючы за распаўсю-

джанне назвы «Беларусь» на ўсю тэрыторыю беларускага племені, ён тым не менш рэдка называў мову беларусаў беларускай. У яго працах яна часцей выступае як мова «мясцовага насельніцтва» або «заходнеруская мова» [6, с. 2; 11]. Па перакананню даследчыка, імя «Белая Русь» або «Беларусь» падкрэслівала сувязь гэтых зямель з Руссю-Расіяй, а шырока вядомае ў XIX ст. паняцце «Заходняя Расія» мела не столькі этнічны, колькі палітыка-геаграфічны сэнс. Паказальна і тое, што пад паняццем «Заходняя Расія» М.В. Каяловіч разумеў не толькі заходнюю частку ўсходніх славян (украінцаў і беларусаў), але і землі этнічнай Літвы [6, с. 1–2]. Даследчык вельмі ўважліва ставіўся да праблемы тэрытарыяльнага і нацыянальнага размежавання паміж беларусамі і палякамі [4; 5], і ў той самы час мала цікавіўся падобным падзелам паміж беларусамі і велікарусамі.

М.В. Каяловіч, пражываючы працяглы час па-за межамі радзімы, даволі ўважліва сачыў за падзеямі ў Беларусі. У першай палове 80-х гг. XIX ст. ён ужо канстатаваў з'яўленне адукаваных «заходнерускіх» людзей, якія размаўляюць на мове свайго мясцовага насельніцтва, і выказваў шкадаванне аб іх малалікасці [6, с. 11]. Больш таго, ён быў адным з тых нешматлікіх расійскіх даследчыкаў, хто прызнаваў нават наяўнасць беларускай галіны ў мясцовай літаратуры [6, с. 16]. Але ўсё гэта было звязана не з праяўленнем у М.В. Каяловіча нацыянальнага пачуцця, а з яго палітычнымі памкненнямі: жаданнем праз пераарыентацыю інтэлігенцыі Беларусі з польскай культуры на мясцовую беларускую зменшыць сацыяльную базу польскага элемента ў краі. У разуменні аўтара беларуская культура выступала як варыянт лакальнай рускай культуры. Пры гэтым ён указваў на тую акалічнасць, што ўкраінскі нацыянальны рух актыўна падтрымліваецца палякамі. Беларусі, па меркаванню аўтара, такая небяспека не паграджае, паколькі беларускае племя блізкае да велікарусаў, і таму ніякі сепаратызм у ім не можа мець сілу [6, с. 18–19].

Толькі разумеючы вышэй указанае, можна разабрацца ў сутнасці этнагенетычных поглядаў М.В. Каяловіча. Аснову беларускага народа, па яго меркаванню, склалі крывічы і дрыгавічы, якія па першым часе не мелі ніякіх прыкмет, што адрознівалі б іх ад іншых усходнеславянскіх плямён [6, с. 60]. Па нейкай прычыне ён зусім не ўзгадваў у сваіх «Чытаннях» (першае выданне ўбачыла свет у 1864 г., а другое роўна праз 20 год у 1884 г.) радзімічаў. Магчымай прычынай таму стала іх верагодна заходняе паходжанне. «Аповесць мінулых часоў» указвала на прыход радзімічаў з захаду. У тагачаснай расійскай гістарыяграфіі нават сустракаецца тэрмін «ляхіцкія» радзімічы. Такая акалічнасць магла стаць важкім аргументам на карысць польскіх шавіністычных ідэй пра блізкасць або нават тоеснасць беларусаў і палякаў. Таму, магчыма, не жадаючы ўздымаць гэтую праблему даследчык проста ігнараваў у сваіх публікацыях факт удзелу радзімічаў у фарміраванні беларускага этнасу. Магчыма і тое, што радзімічы выключаліся з пераліку продкаў беларусаў, паколькі М.В. Каяловіч не вызначаў мяжу паміж беларусамі і велікарусамі і, хутчэй, адносіў радзімічаў да велікарускай галіны.

Для ўсходнеславянскай гістарыяграфіі XIX ст. былі ўласцівы ўяўленні аб існаванні агульнаславянскай еднасці ў старажытнасці. Лічылася, што агульны накірунак этнічнага развіцця славянскага свету ішоў ад агульнаславянскай еднасці да паступовага раз'яднання і распадзення на два або часцей тры часткі: заходніх, паўднёвых і ўсходніх. Далейшае развіццё ўжо ўласна ўсходніх славян працякала таксама ў напрамку ад еднасці да адасаблення. Галоўным фактарам, які паспрыяў з'яўленню асаблівасцей паміж усходняй і заходняй паловай рускага народа, сталі палітычныя падзеі, а менавіта раз'яднанне і адасабленне іх у выніку татара-мангольскага пагрому [6, с. 15, 54–55]. Адметна, што, па сцвярджэнню М.В. Каяловіча, у Беларусі татара-мангольскага іга не было [6, с. 32, 82]. Больш таго, першыя прыкметы падзелу паміж двума часткамі рускага народа даследчык фіксаваў ужо ў другім дзесяцігоддзі XI ст., што ўказвала на наяўнасць і іншых (паміма татара-мангольскага іга, што ўстанавілася ў паўночна-ўсходняй часцы старажытнай Русі, – будучай Расіі) фактараў, якія прадвызначылі фарміраванне гэтых асаблівасцей [6, с. 57]. Падставы і ўмовы ўзнікнення і развіцця падобных асаблівасцей даследчыкам не ўказваліся, што, на наш погляд, сведчыць аб яго нежаданні ўздымаць праблемы адрозненняў паміж беларусамі і велікарусамі і акцэнтаваць на гэтым увагу чытачоў.

Палітычнае адасабленне беларускага племені М.В. Каяловіч бачыў у выдзяленні Полацка, які стаў адным з цэнтраў трох рускіх абласцей: Беларусі, Галіцыі і Масквы [6, с. 68]. Гэтыя і пазнейшыя падзеі (уваходжанне Беларусі ў ВКЛ, а з 1569 г. – у Рэч Паспалітую абодвух народаў) не парушылі тым не менш агульнарускай еднасці. Таму адзінай перспектываю этнічнага развіцця для «заходнерускага народу», па М.В. Каяловічу, можа быць толькі зліццё з велікарусамі [6, с. 51].

Свае аргументы на карысць рускага характару беларусаў павінны былі даць, па меркаванню даследчыка, і археаграфічныя матэрыялы. Не выпадкова яго «Дакументы, што тлумачаць гісторыю Заходне-рускага края і яго адносіны да Расіі і Польшчы» былі апублікаваны адразу пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. [2]. Характэрнай акалічнасцю стала тое, што указаны зборнік быў апублікаваны ў двух варыянтах: на рускай і французскай мовах. Зборнік меў вузкапалітычныя мэты. Ён быў прызваны давесці «рускасць» беларускага рэгіёна і даказаць «недабразычлівцам Расіі» як унутры

краіны, так і па-за яе межамі правы апошняй на Беларусь і тую палітыку, якая пачала праводзіцца пасля падаўлення нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863–1864 гг.

Сур'ёзныя вучоныя, як правіла, не выкарыстоўвалі матэрыялы, падрыхтаваныя Віленскаю археаграфічнай камісіяй або выдадзеныя К.А. Гаворскім, М.В. Каяловічам, П.А. Мmuханавым, А.П. Сапуновым і г. д. Падобнага роду публікацыі арыентаваліся на шырокія колы грамадства і былі выкананы на даволі нізкім узроўні, што значна зніжала іх навуковую карысць [7, с. 230, 237]. Нават з улікам таго, што падбор матэрыялаў у зборнікі ажыццяўляўся, па-большасці, сыходзячы з вузка палітычных мэтаў, апублікаванне значнай колькасці археаграфічных матэрыялаў аб'ектыўна спрыяла ўзмацненню інтарэса да вывучэння Беларусі ў цэлым і беларусаў як этнаса ў прыватнасці. Сама праца публікатараў ёсць сведчанне высокай ступені не толькі палітычнай, але і навуковай зацікаўленасці праблемамі беларускага рэгіёна. Невыпадкова менавіта XIX ст. дало большасць выдадзеных на сённяшні час археаграфічных матэрыялаў па гісторыі Беларусі. Шмат хто з ліку «заходнерусаў», якія былі перакананы ў прыналежнасці беларусаў да вялікарускага або рускага племені, паспрыялі гэтаму працэсу. Больш таго, нярэдка яны прыязна і нават з пяшчотаю адносіліся да адметнасцей беларусаў і ўносілі пэўны ўклад у іх вывучэнне. Але для большасці «заходнерусаў» былі каштоўныя не беларусы самі па сабе, са сваёй цэльнай культураю, моваю і гісторыяй, а тыя старажытныя славянскія або ўсходнеславянскія («рускія») асаблівасці і рысы, што, па іх меркаванню, захаваліся ў Беларусі ў чысціні. Для гэтага кола беларусы мелі, у лепшым выпадку, «слаўнае мінулае», але не мелі будучыні без паступовай дэнацыяналізацыі і трансфармацыі іх у «сапраўды рускіх людзей» [1, с. IV–VI]. Нават у трэцяй чвэрці XIX ст. шэраг навукоўцаў імкнуліся даказаць немагчымасць не толькі палітычнага сепаратызму ў Беларусі, але і «сепаратызму» ў літаратуры (адмаўлялася магчымасць існавання самастойнай беларускай літаратуры і фарміравання беларускай літаратурнай мовы).

Такім чынам, М.В. Каяловіч паўстае як чалавек і даследчык, які пастаянна звяртаўся да праблем сваёй «малой радзімы», свайго народа. З'яўляючыся ў сваіх палітычных перакананнях прыхільнікам «моцнай, магутнай і спакойнай Расіі», М.В. Каяловіч паслядоўна выступаў праціўнікам польскага «элемента» ў краі. З гэтым звязана яго імкненне ўвесь час падкрэсліваць рускі характар беларускага племені, паказваючы апошняе толькі галіною рускага (велікарускага) народа. У той самы час аб'ектыўна яго матэрыялы нярэдка ўказвалі на большую, чым таго сам М.В. Каяловіч жадаў, ступень этнічнай самастойнасці беларускага народа. У асноўных рысах даследчык вызначыў этнічную аснову беларускага народа аналагічна сучасным падыходам да гэтай праблемы – усходнеславянскія плямёны дрыгавічоў і крывічоў (за выключэннем того, што з-за палітычных прычын даследчык «забыўся» на радзімічаў). Ён не ўзгадваў і на ўдзел неславянскіх элементаў у этнагенезе беларусаў. Тым не менш час узнікнення першых асаблівасцей беларускага народа адносіўся М.В. Каяловічам да XI ст.

Пры аналізе ролі М.В. Каяловіча ў фарміраванні поглядаў расійскай гістрыяграфіі на беларускую праблематыку не трэба забывацца і на тое, што яго публікацыі па палітычнай і агульнай гісторыі Беларусі, этнаграфічныя, моваўнаўчыя і археаграфічныя даследаванні аб'ектыўна стымулявалі навуковы і агульнапазнаваўчы інтарэс да гэтай тэматыкі іншых даседчыкаў і навукоўцаў. Ідучы за ім або, наадварот, імкнучыся запярэчыць яму, напрыканцы XIX – пачатку XX ст. паўстаюць такія даследчыкі этагенезу і этнічнай гісторыі беларусаў, як М.В. Доўнар-Запольскі, Я.Ф. Карскі і іншыя выбітныя даследчыкі. Разам з тым няма, нажаль, ніякіх падстаў для залічэння М.В. Каяловіча да ліку ўласна беларускіх гісторыкаў XIX ст., паколькі ён быў і да канца жыцця заставаўся паслядоўным «заходнерусам», вучоным і грамадскім дзеячом, які не прызнаваў факта існавання самастойнага беларускага этнасу.

Бібліяграфічныя спасылкі


1. Бессонов, П. Белорусские песни, с подробными объяснениями их творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта / П.А. Бессонов. М. : Тип. Бахметева, 1871.
2. Документы, объясняющие историю западно-русского края и его отношения к России и к Польше. СПб. : Тип. Э. Праца, 1865.
3. Коялович, М.О. Литовская церковная уния: в 2 т. / М.О. Коялович. СПб. : Тип. Н. Тихменева, 1859.
4. Он же. О расселении племен Западного края России / М.О. Коялович. М. : Тип. Бахметева, 1863.
5. Он же. Взгляд г. Эркерта на Западную Россию / М.О. Коялович. СПб. : Воен. тип., 1864.
6. Он же. Чтения по истории Западной России / М.О. Коялович. СПб. : Тип. А.С. Суворина, 1884.
7. Улащик, Н.Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода / Н.Н. Улащик. М. : Наука, 1973.
8. Цьвікевіч, А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цьвікевіч. 2-е выд. Мінск : Навука і тэхніка, 1993.